# *§ 61–0. Сучаснае беларускае грамадства

ІДЭАЛОГІЯ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ
РЭФЕРЭНДУМ
КАНФЕСІЯ
ГРАМАДЗЯНСКАЯ СУПОЛЬНАСЦЬ
ПАРТЫЯ НАЦЫЯ
ГРАМАДСКАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ

Нацыянальны склад насельніцтва Беларусі

**1. Міжнацыянальныя адносіны.** Большасць сучасных дзяржаў з'яўляюцца поліэтнічнымі. Асаблівасці гістарычнага развіцця Беларусі сталі прычынай з'яўлення на нашых землях прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей. Згодна з вынікамі перапісу 2019 г., у Беларусі жывуць прадстаўнікі 130 нацыянальнасцей.

Наяўныя звесткі дазваляюць казаць пра дынаміку нацыянальнага складу насельніцтва Беларусі — пастунова расце колькасць людзей, якія лічаць сябе беларусамі: у 1999 г. такіх было 81,2 %, у 2009 г. — 83,7 %, у 2019 г. — 84,9 %; доля прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей, за выключэннем кітайцаў, туркменаў і таджыкаў, за прайшоўшыя два дзесяцігоддзі паменшала.

Міжэтнічныя канфлікты зрабіліся часткай палітычнага жыцця многіх сучасных дзяржаў. У шэрагу выпадкаў яны выступаюць сродкам «каляровых рэвалюцый», нагодай для знешняга ўмяшання ва ўнутраныя справы дзяржаў і ціску на іх. Рэспубліка Беларусь — адна з нямногіх рэспублік былога Савецкага Саюза, на тэрыторыі якой не было зафіксавана ніводнага міжнацыянальнага канфлікту.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

У лістападзе 1992 г. у нашай краіне быў прыняты Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь». Згодна з ім пад нацыянальнымі меншасцямі разумеюцца асобы, якія стала пражываюць на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, маюць яе грамадзянства, якія паводле свайго паходжання, мовы, культуры або традыцый адрозніваюцца ад асноўнага насельніцтва рэспублікі.

У адпаведнасці з Законам:

- ніхто не можа быць прымушаны да вызначэння і ўказання сваёй нацыянальнай прыналежнасці, а таксама да даказвання нацыянальнай прыналежнасці або адмовы ад яе;
- грамадзяне Рэспублікі Беларусь незалежна ад нацыянальнай прыналежнасці карыстаюцца абаронай дзяржавы на роўных падставах;
- усякія дзеянні, накіраваныя на дыскрымінацыю па нацыянальнай прыкмеце, стварэнне перашкод у рэалізацыі нацыянальнымі меншасцямі сваіх правоў, распальванне міжнацыянальнай варожасці, цягнуць адказнасць у адпаведнасці з заканадаўствам;
- грамадзянам Рэспублікі Беларусь гарантуецца права карыстацца іх нацыянальнай мовай;
- помнікі гісторыі і культуры нацыянальных меншасцей, якія знаходзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, з'яўляюцца часткай культуры Рэспублікі Беларусь і ахоўваюцца дзяржавай у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

*1. Якія гістарычныя перадумовы шматнацыянальнага складу насельніцтва Беларусі?*

*2. На аснове фрагмента Закона сфармулюйце ўмовы міжнацыянальнага міру і згоды ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь.*

### Дзяржаўная палітыка ў сферы міжнацыянальных адносін

Адным з найважнейшых фактараў стабільнасці міжнацыянальных адносін выступае паслядоўная палітыка беларускай дзяржавы ў гэтай сферы грамадскага жыцця. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь гарантуе грамадзянам, якія адносяць сябе да нацыянальных меншасцей, роўныя палітычныя, эканамічныя і сацыяльныя правы і свабоды. Кожны мае права захоўваць сваю нацыянальную прыналежнасць, а абраза нацыянальнай годнасці пераследуецца законам.

Каардынацыяй дзейнасці органаў дзяржаўнага кіравання ў сферы міжнацыянальных і міжканфесійных

адносін у Беларусі, а таксама ажыццяўленнем дзяржаўнай палітыкі ў гэтай галіне займаецца Упаўнаважаны па справах рэлігій і нацыянальнасцей і яго апарат, які знаходзіцца ў падпарадкаванні Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

**Развіццё мовы і культуры нацыянальных меншасцей**

Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь у дачыненні да нацыянальных меншасцей грунтуецца на прынцыпах культурнай разнастайнасці і захавання міжнацыянальнай згоды ў беларускім грамадстве. У краіне створаны спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця культуры і мовы нацыянальных меншасцей, дзейнасці іх арганізацый, устаноў культуры і адукацыі. На 1 снежня 2024 г. у Беларусі было зарэгістравана 140 нацыянальна-культурных грамадскіх аб'яднанняў прадстаўнікоў 25 нацыянальнасцей. Пры аб'яднаннях створаныя творчыя калектывы, працуюць нядзельныя школы па вывучэнні мовы і культуры сваёй гістарычнай радзімы. Пачынаючы з 1996 г. раз на 2 гады ў г. Гродна праводзіцца рэспубліканскі фестываль нацыянальных культур. Яго галоўная ідэя — паказаць самабытнасць народаў, што насяляюць Беларусь, іх культурныя каштоўнасці.



*Фестываль нацыянальных культур. Г. Гродна. 2024 г.*

**2. Канфесійная палітыка дзяржавы.** Рэспубліка Беларусь — шматканфесійная дзяржава, маральным падмуркам якой з'яўляюцца хрысціянскія каштоўнасці. Як і шматнацыянальнасць, шматканфесійнасць абумоўлена асаблівасцямі гістарычнага развіцця Беларусі.

**Дзяржаўная канфесійная палітыка**

Канстытуцыя і Закон Рэспублікі Беларусь «Аб свабодзе сумлення і рэлігійных арганізацыях» сцвярджаюць роўнасць усіх рэлігій і веравызнанняў перад законам. Пры гэтым дзяржава не ўмешваецца ў пытанні асабістага веравызнання, ва ўнутраныя справы канфесій; кантроль за дзейнасцю рэлігійных арганізацый абмяжоўваецца сферай выканання імі заканадаўства рэспублікі.

## ГІСТОРЫЯ І СУЧАСНАСЦЬ

Па стане на 1 студзеня 2024 г. у Рэспубліцы Беларусь зарэгістравана 25 канфесій і рэлігійных кірункаў.

| | |
|---|---|
| Беларуская праваслаўная царква | 15 епархій, 1737 праваслаўных прыходаў |
| Рымска-каталіцкая царква | 4 епархіі, 500 абшчын |
| Пратэстанцкая царква | 1038 абшчын |
| Грэка-каталіцкая царква | 16 абшчын |

У Рэспубліцы Беларусь таксама зарэгістраваны 34 рэлігійныя абшчыны стараабрадцаў, 24 мусульманскія абшчыны, 51 іўдзейская рэлігійная абшчына.

1. *Якія гістарычныя перадумовы шматканфесійнага складу насельніцтва Беларусі?*
2. *Якія, на вашу думку, умовы міжканфесійнага міру і згоды ў сучаснай Рэспубліцы Беларусь?*

Канфесійная палітыка беларускай дзяржавы скіраваная на падтрымку і ўмацаванне міжканфесійнага міру і згоды ў беларускім грамадстве, аб'яднанне намаганняў розных груп вернікаў вакол канструктыўных, стваральных мэт, развіццё ўзаемадзеяння з гістарычна традыцыйнымі канфесіямі. У першую чаргу гэта датычыцца Беларускай праваслаўнай царквы, бо духоўныя і культурныя каштоўнасці, якія яна захоўвае, уяўляюць сабой асноватворную частку гістарычнай спадчыны Беларусі і нацыянальнай самасвядомасці беларусаў.



*Герой Беларусі Мітрапаліт Філарэт (Вахрамееў)*

У 2003 г. падпісанае Пагадненне аб супрацоўніцтве паміж Рэспублікай Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквой. Прыярытэтнымі кірункамі супрацоўніцтва выступаюць фарміраванне асобы чалавека, духоўна-маральнае і патрыятычнае выхаванне дзяцей і моладзі, садзеянне ў аднаўленні і развіцці гістарычнай і культурнай спадчыны, падтрымка інстытута сям'і, мацярынства і дзяцінства.

Беларуская дзяржава ў поўнай меры забяспечвае рэалізацыю права на свабоду сумлення, дае

грамадзянам свабоду ў выбары веры або нерэлігійнага светапогляду. У адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь кожны грамадзянін мае права самастойна вызначаць сваё стаўленне да рэлігіі, асобна або супольна з іншымі грамадзянамі вызнаваць любую рэлігію або не вызнаваць ніякай, удзельнічаць у выкананні рэлігійных культаў, абрадаў, не забароненых законам.

У нашай краіне забаронена дзейнасць рэлігійных арганізацый, якая накіравана супраць суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, яе канстытуцыйнага ладу, грамадзянскай згоды або звязаная з парушэннем правоў і свабод грамадзян, перашкаджае выкананню грамадзянамі дзяржаўных, грамадскіх, сямейных абавязкаў, чыніць шкоду здароўю людзей.

**Значэнне каштоўнасных арыентацый у сучасным свеце**

**3. Каштоўнасныя арыентацыі.** Сучасная геапалітычная сітуацыя робіць надзвычай важным пытанне наконт каштоўнасцей грамадства. З аднаго боку, сусветная супольнасць сутыкнулася са спробай

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Супрацоўнікі Беларускага інстытута стратэгічных даследаванняў правялі даследаванне «Каштоўнасны партрэт сучаснага беларускага грамадства» (https://bisr.gov.by). Паводле яго вынікаў вылучаныя дзве групы каштоўнасцей беларусаў: асабова-сямейныя (індывідуальныя) і калектыўныя (дзяржаваўтваральныя). Да самых значных для беларусаў належаць:

| Дзяржаваўтваральныя | Індывідуальныя |
|---|---|
| Мір | Здароўе |
| Бяспека | Бацькі |
| Свабода | Душэўны спакой і камфорт |
| Парадак | Муж (жонка) |
| Справядлівасць | Дзеці |

*1. Якімі асаблівасцямі гістарычнага развіцця нашай краіны, на вашу думку, абумоўлены такія каштоўнасныя прыярытэты беларусаў?*

*2. Як вы лічыце, чаму такія каштоўнасці, як мір, бяспека, свабода, парадак, справядлівасць, аднесены да дзяржаваўтваральных?*

пераацэнкі гістарычнай і культурнай спадчыны цэлых пакаленняў, штучнага супрацьпастаўлення «дэмакратычных» і «традыцыйных» каштоўнасцей, дэфармацыяй гістарычнай памяці — наўмысным і мэтанакіраваным скажэннем гісторыі. З другога боку, вырасла грамадзянская самасвядомасць і цікавасць да ўласнай гісторыі і культуры. Часцей сталі гучаць пытанні: «Куды мы ідзём?», «Якія каштоўнасці нас аб'ядноўваюць?».

**Традыцыйныя сямейныя каштоўнасці**

Сучаснае беларускае грамадства захоўвае *прыхільнасць да традыцыйных каштоўнасцей*: сям'я як саюз жанчыны і мужчыны, мір, здароўе, дабрабыт сям'і і краіны, душэўны камфорт, імкненне забяспечыць сваім дзецям і ўнукам больш высокія стандарты жыцця. Грамадства адвяргае скажэнне гістарычнай памяці пра подзвіг савецкага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны, навязванне ўсялякіх чужых нормаў і мадэляў паводзін. Гэта атрымала адлюстраванне ў абноўленай Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

Якім чынам традыцыйныя сямейныя каштоўнасці замацаваныя ў Асноўным Законе Рэспублікі Беларусь?

**Хрысціянскія каштоўнасці**

У іерархіі духоўных каштоўнасцей беларускага народа асаблівае значэнне маюць *хрысціянскія каштоўнасці*: любоў да бліжняга, цярпімасць, выкананне хрысціянскіх запаведзяў. Беларусы ўмеюць дараваць, але ніколі не дапусцяць здрады і падступнасці, заўсёды гатовыя адэкватна адказаць тым, хто прыходзіць да нас, «трымаючы камень за пазухай».

**Спалучэнне індывідуальных і грамадскіх каштоўнасцей**

Сучасныя беларусы жадаюць, каб дабрабыт пашыраўся не толькі на матэрыяльны бок жыцця, але і на ўзаемаадносіны паміж людзьмі. Таму *індывідуальныя каштоўнасці беларусаў гарманічна спалучаюцца з грамадскімі* ў дзейнасці, скіраванай на карысць роднай краіны.

*Беларусам чужыя яскрава выражаны індывідуалізм і эгаізм*, да якіх хіліцца заходняя цывілізацыя. Важнае месца займаюць традыцыі ўзаемадапамогі і супольнай працы. Яшчэ ад часоў старажытнасці беларусы аб'ядноўваліся для вырашэння бытавых

пытанняў (гэтая практыка вядомая пад назвай «талака»), што дазваляла паспяхова пераадольваць цяжкасці.

**Працавітасць**

Беларускі народ вылучаюць *працавітасць і працаздольнасць*, адказнае стаўленне да справы, гаспадарлівасць і грунтоўнасць. Сучасныя беларусы гатовыя дэманстраваць здольнасць да самарэалізацыі, чакаюць ад дзяржавы забеспячэння роўных стартавых умоў для руху наперад. Пры гэтым наша разуменне правоў чалавека адрозніваецца ад заходняга, дзе правы меншасцей робяцца важнейшыя за правы большасці, дзе індывідуальнае вышэйшае за грамадскае.

**Патрыятызм**

Важнай каштоўнасцю беларускага грамадства з'яўляецца *патрыятызм*. Для беларусаў патрыятызм — гэта перш за ўсё любоў да сваёй краіны, яе гісторыі, культуры, мовы і актыўная дзейнасць, стваральная праца на карысць краіны.



***Карват Уладзімір Мікалаевіч***
*(1958–1996 гг.)*
*Герой Беларусі. Падпалкоўнік авіяцыі. 23 мая 1996 г. адвёў самалёт, які падаў, ад населенага пункта, ахвяраваўшы жыццём*



***Нічыпарчык Андрэй Уладзіміравіч***
*(1987–2021 гг.)*
*Герой Беларусі. Ваенны лётчык, маёр. 19 мая 2021 г. адвёў самалёт, які падаў, ад населенага пункта, ахвяраваўшы жыццём*



***Куканенка Мікіта Барысавіч***
*(1998–2021 гг.)*
*Герой Беларусі. Ваенны лётчык, лейтэнант. 19 мая 2021 г. адвёў самалёт, які падаў, ад населенага пункта, ахвяраваўшы жыццём*

1. Як вы лічыце, якія каштоўнасці, матывы вызначылі ўчынкі гэтых герояў?
2. Як бы вы адказалі на пытанне: якія галоўныя каштоўнасці чалавека?

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ



















*Другая нядзеля мая*

1. *Якія гістарычныя падзеі прадвызначылі гэтыя дзяржаўныя святы?*
2. *Якія каштоўнасныя арыенціры беларускага народа адлюстроўваюць дзяржаўныя святы Рэспублікі Беларусь?*

У 2020 г. беларускі народ сутыкнуўся са спробай дзяржаўнага перавароту з мэтай захопу ўлады неканстытуцыйным шляхам і зразумеў, як лёгка страціць мір і бяспеку. У выніку менавіта гэтыя каштоўнасці зрабіліся прыярытэтнымі для насельніцтва. Наша адметная рыса — міралюбства.

**Свабода і сацыяльная адказнасць**

Беларусы цэняць *свабоду*. Аднак свабода — гэта не ўсёдазволенасць. Здаровае грамадства — калектыў грамадзян з высокаразвітой сацыяльнай адказнасцю, якія разумеюць, што акрамя правоў яны маюць яшчэ і абавязкі.

**Гістарычная памяць**

Важная каштоўнасць беларускага грамадства — *гістарычная памяць*. Асаблівасцю яе для нашага народа з'яўляецца ўзважанае ўспрыняцце гістарычнага мінулага праз прызму Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне. Унёсак беларускага народа ў Вялікую Перамогу — гэта прадмет нацыянальнага гонару.

Каштоўнасці беларускага грамадства — гэта тое, што сёння аб'ядноўвае розныя пакаленні, падмурак, які дазволіць нашай краіне выстаяць у сучасных геапалітычных умовах.

*Аб'ектыўная ацэнка гістарычнай мінуўшчыны*

**4. Гістарычная палітыка Рэспублікі Беларусь.** Асноўнае прызначэнне дзяржаўнай гістарычнай палітыкі — не дапусціць скажэння і фальсіфікацыі гістарычных падзей на шкоду нацыянальнай самасвядомасці, аўтарытэту нацыі, фарміраваць аб'ектыўныя ацэнкі гістарычнай мінуўшчыны і забяспечваць іх пазітыўнае ўспрыняцце грамадствам.

Беларуская гістарычная палітыка атрымала штуршок да развіцця ў 1995 і 1996 гг., калі грамадзяне краіны падчас рэспубліканскіх рэферэндумаў падтрымалі прынцыповыя падыходы Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь да дзяржаўнай сімволікі, дзяржаўных моў, святкавання Дня Незалежнасці ў адну з самых знакавых для Беларусі дат у гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — 3 ліпеня.

*Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы*

У лютым 2022 г. у Беларусі быў створаны Рэспубліканскі савет па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Гэта пастаянна дзеючы міжведамасны кансультацыйны і каардынуючы орган па правядзенні адзінай дзяржаўнай палітыкі ў сферы гістарычнай памяці.

*Канцэпцыя гісторыі беларускай дзяржаўнасці*

Беларускія гісторыкі распрацавалі Канцэпцыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці. У адпаведнасці з ёю беларуская дзяржаўнасць у працэсе эвалюцыі была рэалізаваная ў дзвюх формах — гістарычнай і нацыянальнай. Полацкае і Тураўскае княствы, Старажытная Русь, Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, Расійская імперыя — гэта гістарычныя формы дзяржаўнасці на нашых землях, у рамках якіх паступова фарміравалася дзяржаўнасць беларускага народа. У XX ст. яна знайшла рэальнае ўвасабленне ў нацыянальных формах:

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

**Нарада ў Кіраўніка дзяржавы. 6 студзеня 2022 г.:**

*«Мы павінны прызнаць, што старонкі айчыннай гісторыі ператварыліся ў інфармацыйнае поле бою. Сёння гістарычная палітыка з'яўляецца для нас стратэгіяй самазахавання ва ўмовах глабальнага перадзелу сфер уплыву ў свеце. Гэта фактар нацыянальнай бяспекі».*

*А. Р. Лукашэнка*

Прэзідэнт паказаў на неабходнасць даць адэкватную ацэнку ўсіх гістарычных перыядаў на тэрыторыі Беларусі, у тым ліку часоў Полацкага і Тураўскага княстваў, Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай, СССР, выпрацаваць дакладную канцэпцыю ацэнкі падзей і ролі асоб у гісторыі беларускай дзяржавы.

**Пасланне беларускаму народу і Нацыянальнаму сходу. Сакавік 2023 г.**

*«<…> Людзі мусяць ведаць, хто нашы героі, выхоўваць на іх прыкладах новыя пакаленні беларусаў. Хатынь, Ола, Боркі, Брэсцкая крэпасць і ўсе месцы трагедыі і подзвігу беларускага народа, народаў СССР павінны зрабіцца месцам паломніцтва і пакланення».*

Прэзідэнт даручыў Савету па гістарычнай палітыцы ўкараніць канцэпцыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці ва ўсе сферы жыцця грамадства.

1. *Як вы разумееце меркаванне: «Гістарычная палітыка зрабілася неад'емнай часткай нацыянальнай бяспекі»?*
2. *Чаму сёння важна ўкараніць канцэпцыю гісторыі беларускай дзяржаўнасці ва ўсе сферы жыцця грамадства?*
3. *Чаму важна фарміраваць і захоўваць гістарычную памяць беларускага народа?*
4. *Пра якія гістарычныя падзеі, на вашу думку, павінен ведаць і памятаць кожны беларус?*

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка, Рэспубліка Беларусь.

З мэтай рэалізацыі прынцыпаў гістарычнай палітыкі беларускай дзяржавы і фарміравання аб'ектыўных ацэнак гістарычнай мінуўшчыны ва ўсіх установах сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі



*Мемарыяльны комплекс «Курган Славы». 3 ліпеня 2025 г.*

ўведзена новая гістарычная дысцыпліна — «Гісторыя беларускай дзяржаўнасці».

Найважнейшае месца ў гістарычнай палітыцы Рэспублікі Беларусь займае захаванне памяці пра гісторыю Вялікай Айчыннай вайны, гераізм і самаадданасць беларускага народа. Згодна з арт. 54 Канстытуцыі захаванне гістарычнай памяці пра гераічную мінуўшчыну беларускага народа, патрыятызм з'яўляюцца абавязкам кожнага грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.

**Грамадзянская супольнасць** — асаблівая сфера грамадскіх адносін, сістэма самастойных і адносна незалежных ад дзяржавы інстытутаў, грамадскіх інтарэсаў, адносін.

**5. Палітычныя партыі і грамадскія арганізацыі ў сучаснай Беларусі.** Дзяржаўная палітыка Рэспублікі Беларусь накіраваная на пабудову дзяржавы з развітой **грамадзянскай супольнасцю**, якая прадугледжвае шырокі ўдзел грамадзян у грамадскім жыцці і прыняцці важных рашэнняў.

Важным механізмам рэалізацыі правоў грамадзян на выказванне сваіх грамадска-палітычных поглядаў і інтарэсаў выступаюць грамадскія аб'яднанні — палітычныя партыі, грамадскія арганізацыі.

У 1994 г. Вярхоўным Саветам быў прыняты Закон «Аб палітычных партыях», які замацаваў парадак стварэння і дзейнасці палітычных партый.

**Умовы дзейнасці палітычнай партыі**

Заснавальнікамі палітычнай партыі могуць быць толькі грамадзяне Рэспублікі Беларусь, якія дасягнулі ўзросту 18 гадоў, валодаюць выбарчым правам, не абмежаваныя судом у дзеяздольнасці,

не знаходзяцца ў месцах пазбаўлення волі. Для стварэння палітычнай партыі неабходна не менш за 1000 членаў. Стварэнне ў Беларусі палітычных партый іншых дзяржаў забаронена. Забаронена дзейнасць палітычных партый, мэта якіх — гвалтоўнае змяненне канстытуцыйнага ладу, прапаганда вайны, рэлігійнай, нацыянальнай і расавай варожасці.

Па стане на студзень 2025 г. у Рэспубліцы Беларусь зарэгістраваныя чатыры палітычныя партыі: Беларуская партыя «Белая Русь», Ліберальна-дэмакратычная партыя Беларусі, Камуністычная партыя Беларусі, Рэспубліканская партыя працы і справядлівасці, якія ў поўнай меры падтрымліваюць унутраную і знешнюю палітыку дзяржавы.

На нарадзе з кіраўнікамі палітычных партый у лістападзе 2023 г. Кіраўнік дзяржавы вызначыў умовы партыйнага будаўніцтва ў Беларусі: партыі павінны зрабіцца памочнікам улады ў тлумачэнні, прасоўванні і ўдзеле ў рашэннях, якія прымаюцца: «Не змагацца з дзяржавай, а канкурыраваць паміж сабой на ўзроўні праектаў, заканадаўчых ініцыятыў».

## Грамадскія арганізацыі

Грамадскія арганізацыі, у адрозненне ад палітычных партый, не ставяць за мэту ўдзел у палітычнай барацьбе за ўладу, але адыгрываюць вялікую ролю ў грамадскім жыцці краіны.

Сярод найбольш значных грамадскіх арганізацый у Беларусі — прафесійныя саюзы, якія бароняць працоўныя, сацыяльна-эканамічныя правы і інтарэсы грамадзян (паляпшэнне ўмоў працы, павышэнне заработнай платы). Федэрацыя прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) аб'ядноўвае каля 4 млн чалавек. Прафсаюзы ажыццяўляюць грамадскі кантроль за выкананнем заканадаўства аб працы: выплата заработнай платы, захаванне працоўных гарантый, выкананне наймальнікам калектыўных дамоў; ажыццяўляюць на бязвыплатнай аснове прававую дапамогу.

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

*Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, падрыхтуйце паведамленні-прэзентацыі аб мэтах, асноўных кірунках дзейнасці і праектах грамадскіх аб’яднанняў у Рэспубліцы Беларусь.*

Важную ролю ў грамадскім жыцці краіны адыгрываюць рэспубліканскія грамадскія аб’яднанні «Белая Русь» і «Беларускі саюз жанчын» (БСЖ), ветэранскія і спартыўныя арганізацыі, самыя масавыя маладзёжныя аб’яднанні — Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі (БРСМ) і Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя (БРПА). У 2022 г. апошняя была ўшанаваная высокай узнагародай — спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» — за значны ўнёсак у грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення, рэалізацыю сацыяльна значных дзіцячых праектаў і ініцыятыў.

Галоўнымі мэтамі БРСМ з’яўляюцца стварэнне ўмоў для ўсебаковага развіцця моладзі, раскрыццё яе творчага патэнцыялу, садзеянне развіццю ў рэспубліцы грамадзянскай супольнасці, заснаванай на патрыятычных і духоўна-маральных каштоўнасцях.

*Сучаснае беларускае грамадства з'яўляецца шматнацыянальным і шматканфесійным. Найважнейшай умовай захавання міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды ў рэспубліцы выступае паслядоўная дзяржаўная палітыка ў гэтых пытаннях. Ва ўмовах сучасных глабальных выклікаў для беларускага грамадства прынцыпова важна захаваць каштоўнасці, якія адпавядаюць нацыянальным інтарэсам: непарушнасць асноў канстытуцыйнага ладу, баланс інтарэсаў асобы і дзяржавы, павага і давер да легітымнай улады, стваральнасць, прыярытэт нацыянальных інтарэсаў над прыватнымі, справядлівасць, непрынятце ціску звонку. Дзяржаўная гістарычная палітыка — важны фактар забеспячэння нацыянальнай бяспекі, захавання суверэнітэту і незалежнасці.*

**калі ў свеце…**

2022 г. — Год культурнай спадчыны народаў Расіі

**на тэрыторыі Беларусі…**

2022 г. — Год гістарычнай памяці

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Сфармулюйце ў выглядзе тэзісаў асноўныя палажэнні беларускага заканадаўства, якія забяспечваюць міжнацыянальную і міжканфесійную згоду ў беларускім грамадстве.
2. Якімі дасягненнямі ў галіне міжнацыянальных і міжканфесійных адносін могуць ганарыцца грамадзяне нашай краіны?
3. Чаму пытанне аб каштоўнасных арыентацыях грамадства асабліва значнае ў сучасным свеце? Ахарактарызуйце каштоўнасці сучаснага беларускага грамадства. Якія з іх, на ваш погляд, асабліва важныя для захавання адзінства грамадства?
4. Якая асноўная мэта дзяржаўнай гістарычнай палітыкі Рэспублікі Беларусь?
5. Ахарактарызуйце ролю палітычных партый і грамадскіх арганізацый у рэспубліцы.